Карыснае хобі

# ПАД БРЭНДАМ «СВАЁ»

## Рукадзелле зноў набывае папулярнасць



Фота з архіва Анастасіі СТАДНІКАВАЙ.

Выпускніца біяфака Насця СТАДНІКАВА носіць усё сваё.

**Заняткі па працоўным навучанні ў нашай школе штогод праходзілі па аднолькавым сцэнарыі. Першую чвэрць мы кулінарылі, у астатнія — «прыручалі» швейную машынку (бачылі б вы гэтыя ледзь не дарэвалюцыйныя агрэгаты!). З гатаваннем я «не пасябравала» з самага пачатку. Іншая справа — рукадзелле. Валодаць іголкай і спіцамі мяне некалі навучыла маміна знаёмая, таму сурвэткі-шалікі-ручнікі я майстравала не толькі на школьных занятках, але і ў вольны час дома. Праўда, не прызнавалася сябрам. Не па-маладзёжнаму гэта было — вышываць увечары крыжыкам.**

У студэнцкія гады сапраўднай знаходкай сталі часопісы з выкрайкамі. Тое, што трэба, калі канструяваць адзенне не ўмееш, а пашыць нешта па фігуры вельмі хочацца. Ледзь не кожны месяц частка маёй стыпендыі заставалася ў крамах, дзе прадавалі тканіну. Рабіла блузкі, спадніцы, сукенкі... Не ўсё атрымлівалася, вядома. Дагэтуль у кутках шафы сарамліва хаваюцца ні разу не апранутыя вырабы. Затое кожная ўдалая рэч прыносіла кампліменты ад сябровак і ўпэўненасць у тым, што больш ніхто з тваіх сакурсніц не прыйдзе ў такім жа строі.

Даўно заўважыла, што колькасць аматараў рукадзелля сярод сучасных дзяўчат павялічваецца. Напрыклад, **Даша ПУЗЫРОВА** — эканаміст па адукацыі. Па спецыяльнасці дзяўчына працаваць так і не пайшла: захапілася перынатальнай псіхалогіяй (галіна, якая даследуе псіхічнае жыццё ненароджанага дзіцяці ці немаўляці) і вырашыла змяніць прафесію. Цяпер Даша завочна атрымлівае другі дыплом, а ў вольны час шые сабе адзенне. Майстраваць вучылася сама, шляхам спроб і памылак. «Глядзела, як мама рабіла адзенне для сябе, а потым у сеціве натхніла дзяўчына-рамесніца», — прыгадвае яна. Лёгкія бавоўняныя тканіны ў кветкі і гарошак — Дашына слабасць. Будучы псіхолаг аддае перавагу доўгім спадніцам. «У нас доўгія сукенкі, такія, каб цалкам задавальнялі, купіць праблематычна. А так — выбрала тканіну, якая спадабалася, прадумала фасон і пашыла», — тлумачыць яна свой выбар.

Даша часта ходзіць у сваіх строях і да кампліментаў ад знаёмых ужо прывыкла. «Сябры ўгаворваюць паўдзельнічаць у мінскіх фэшн-маркетах, але я да гэтага яшчэ не дарасла, напэўна. Магчыма, у будучыні паспрабую», — сціпла прызнаецца дзяўчына. Пачуўшы пытанне «Ці не думала ператварыць сваё хобі ў працу?», майстрыха задумалася: «Каб зрабіць гэта заробкам, трэба або наймаць работнікаў, або самой шыць бесперапынна, што асабіста для мяне непрымальна. Такая дзейнасць будзе, хутчэй, стамляць. Хаця попыт на працу рамеснікаў штогод расце, бо для многіх важная індывідуальнасць і цеплыня, якая закладзена ў хэнд-мэйд рэчах».

Сёлетняя выпускніца біялагічнага факультэта БДУ **Насця СТАДНІКАВА** захапляецца вязаннем і вырабляе цёплыя капелюшы і шалікі на заказ. Дзяўчына распавядае, як у дзяцінстве бегала з іголкай па доме і сшывала кавалачкі тканіны ў адзенне для лялек. «Пасля ўбачыла, як бабуля вяжа кручком, і папрасіла навучыць. Мне тады было сем гадоў. Атрымалася не адразу. І пальцы балелі, і перарабляла адно і тое ж па некалькі разоў, і мора слёз было, але не здавалася. Першай маёй працай стала маленькая сумачка, 10 на 10 сантыметраў, цераз плячо. Потым я вязала падобныя сумкі аднакласніцам на дні нараджэння».

**«І пальцы балелі, і перарабляла адно і тое ж па некалькі разоў, і мора слёз было, але не здавалася. Першай маёй працай стала маленькая сумачка, 10 на 10 сантыметраў, цераз плячо».**

Цяпер Насця з дапамогай кручка і спіц вырабляе самыя розныя рэчы: шкарпэткі, кофты, галаўныя ўборы, аксесуары для дома. «Не хачу паказацца самаўпэўненай, але для мяне не існуе складаных работ у вязанні, — кажа яна. — Усё ж такі стаж — 15 гадоў». Працуе дзяўчына хутка. На пару шкарпэтак ідзе 6-7 гадзін, на зімовы камплект (капялюш, шалік, рукавіцы) — паўтара дня. А за тры дні майстрыха паспявае звязаць стандартную кофту без узораў.

Спачатку Насця вязала толькі для сябе і блізкіх. Гартала модныя часопісы, шукала рэчы, якія яшчэ не з'явіліся ў продажы ў крамах. Потым пачала рыхтаваць самаробныя падарункі прыяцелям, а праз колькі часу замаўляць вязаныя рэчы сталі знаёмыя знаёмых. Дзяўчына нават не заўважыла, як хобі перарасло ў падпрацоўку. У асноўным заказы паступаюць восенню і ўзімку. «Мне падабаецца ствараць праз свае рэчы ўтульнасць. Парады рамеснікам-пачаткоўцам? Набярыцеся цярплівасці і ніколі не адступайце ад сваіх ідэй. Атрымлівайце задавальненне ад працы, тады ўсё будзе выдатна».

Чаму рукадзелле зноў стала папулярным? Дзесьці гэта спосаб сэканоміць на пакупках. Хаця з улікам кошту швейнай машынкі (у сярэднім 300 долараў), курсаў па кройцы і шыцці (два месяцы навучання абыдуцца прыкладна ў 100 долараў — не абавязкова, але карысна) і ўласнага затрачанага часу атрымліваецца не так ужо і танна. Дый тканіна розная бывае. Самі разумееце, натуральны шоўк і сінтэтыка — рэчы непараўнальныя. Рабіць адзенне сваімі рукамі сталі, верагодна, таму, што захацелася якасці і эксклюзіву па прымальных коштах. Да таго ж, у адказ на пытанне «Адкуль паліто?» вельмі прыемна прызнацца, што пашыў яго сам.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

Камандны дух

# ГУЛЬНЯ РАШУЧЫХ І... СУМЛЕННЫХ

**Сумняваюся, што знойдзецца шмат людзей, якія не чакаюць выхадных. Некалькі дзён, свабодных ад працы, заўсёды хочацца правесці выдатна адпачыўшы. Адным з такіх спосабаў баўлення часу з'яўляецца страйкбол — ваенна-тактычная камандная гульня, якая ўсё больш набывае папулярнасць. Яна пераносе вас у свет «баявых дзеянняў», дасць шанц займальна правесці выхадны дзень і падтрымаць у норме фігуру. Так лічыць і адзін з аматараў страйкбола Уладзіслаў Валахановіч. На мае пытанні пагадзіўся адказаць адзін з яе аматараў Уладзіслаў ВАЛАХАНОВІЧ.**



— Раней я часта чуў пра гульню, але меў дакладнага ўяўлення, што гэта такое. Мне стала цікава, і аднойчы я звярнуўся па дапамогу да інтэрнэту. Так даведаўся пра страйкбольныя клубы, пра цэны і, вядома ж, правілы гульні. І вось, прыкупіўшы рыштунак і амуніцыю, адправіўся ў першы «бой».

**— І якія ўражанні ён пакінуў?**

— Вядома, такое немагчыма забыць. Калі ты ўпершыню выходзіш на гульнявую пляцоўку, у цябе ў галаве круцяцца пытанні: «Дзе я? Што мне рабіць?» Ужо потым, калі асвоішся, з'яўляецца адрэналін, пачуцці, якія цяжка перадаць словамі!

**— А што з сябе ўяўляе гульнявая пляцоўка?**

— Найчасцей гэта закінутыя будынкі, лагеры або ўзгорыстая лясная мясцовасць. Галоўнае, каб яна не выкарыстоўвалася і амаль не наведвалася людзьмі. Удзельнікі загадзя агаворваюць сцэнарый, ставяць мэту і задачы: захоп будынкаў, знішчэнне «дыверсантаў» або «тэрарыстаў». Усё залежыць ад колькасці гульцоў і ад іх інтарэсаў. Ёсць, напрыклад, гульні, калі «баец» аказваецца адзін супраць усіх. У такія моманты абуджаюцца інстынкты, арганізм працуе на ўсю моц.

**— Што, па-твойму, самае цікавае ў гульні?**

— Тое, што на пляцоўцы ты бачыш свайго саперніка ў прыцэле «зброі», а праз паўгадзіны з ім жа каля вогнішча абмяркоўваеш гульнявыя моманты і смяешся з іх. Усё ж страйкбол — гульня сяброў. А нязручнасцю можа стаць надвор'е. Можна выпацкацца, замерзнуць ці прамокнуць... Але яно таго варта.

**— Якія патрабаванні прад'яўляюцца да ўдзельнікаў?**

— Гулец павінен быць старэйшы за 18 гадоў (але некаторыя арганізатары дазваляюць гуляць пры наяўнасці пісьмовага дазволу бацькоў і пры меншым узросце), мець абмундзіраванне, быць псіхічна здаровым... І сумленным.

**— Няўжо сумленне адыгрывае такую важную ролю?**

— Безумоўна. Бо страйкбол — гэта гульня, у якой няма ніякіх сігналаў аб тым, што вас «паранілі». Пры пападанні «кулі» — пластыкавага шарыка — вы часова выходзіце з гульні, надзеўшы чырвоную павязку. Але шарыкі зусім лёгкія (вагой ад 0,12 да 0,43 грама), здараецца, што ты не адчуваеш іх пападання. Для такіх выпадкаў на полі «бою» працуе суддзя, які сочыць за захаваннем правілаў і вырашае падобныя сітуацыі.

**— Які мінімум амуніцыі трэба купіць навічкам?**

— Найперш за ўсё камуфляж, ахоўныя акуляры і «зброю». Дарэчы, у страйкбольных клубах усё гэта можна ўзяць напракат. Асвоіцеся — тады купіце сваё.

...Што ж, засталося перасіліць сябе, забыцца ў выхадны пра любімую канапу і камп'ютар — і ў «бой». Спадзяюся, да хуткай сустрэчы на страйкбольнай пляцоўцы!

**Анастасія КУЛІНЧЫК,**
**выпускніца 11 класа СШ №162**
*г. Мінска.*

Экзотыка ў доме

# СЯБРЫ МАЕ, ЛОРЫ І ШЫНШЫЛА

**Мода — цікавая штука. Яна распаўсюджваецца не толькі на адзенне, упрыгажэнні, музыку. Сёння нармальный з'явай лічыцца і мода на хатніх гадаванцаў. Нікога ўжо не здзівіш рэдкімі пародамі сабак, катоў, папугаяў ці рыбак. Звычайная справа завесці дома павукоў, змей, вожыкаў ці наогул кракадзілаў.**

Але на ўтрыманне апошніх, як і іншых рэдкіх «суседзяў», трэба афармляць спецыяльны дазвол Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Пералік жывёл, якія падлягаюць афармленню, прыведзены ў СІТЭС (пералік відаў жывёл і раслін, што падпадаюць пад дзеянне Канвенцыі аб міжнародным гандлі відамі дзікай флоры і фауны, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення). Яго можна знайсці на афіцыйным сайце міністэрства. Дазвол афармляецца таксама на віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу. Акрамя таго, патэнцыяльны ўладальнік падобных жывёл абавязаны прадставіць спецыяльнай камісіі доказ таго, што ён можа забяспечыць неабходныя ўмовы для іх камфортнага ўтрымання.

Пра незвычайных хатніх гадаванцаў і тое, як важна іх уладальнікам мець стасункі паміж сабой, расказвае **Андрэй САЎЧУК, стваральнік айчыннага некамерцыйнага сайта для аматараў экзатычных жывёл exoclub.by:**

— Я проста люблю жывёл і цікаўлюся імі з дзяцінства. У мяне дома жывуць



Фота Андрэя САЎЧУКА.

лемуры, вавёркі, яноты, лоры, вожыкі, яшчаркі і павукі-птушкаеды. Набыць такіх жывёл даволі лёгка. У Мінску хапае заводчыкаў, якія спецыялізуюцца на кім заўгодна. «Аформіць» гадаванцаў таксама няцяжка. Для гэтага спатрэбяцца дакументы, якія ёсць атрымліваецца ад прадаўца. З імі трэба звярнуцца ў Мінпрыроды. Гэтым вы пацвярджаеце, што купілі жывёлу на законных падставах і што яна здаровая... Наш сайт ствараўся з мэтай аб'яднаць усіх, хто валодае цікавымі экземплярамі экзатычных выхаванцаў ці проста цікавіцца гэтай тэмай. На сайце ёсць форум, дзе ахвотныя могуць абмяркоўваць любыя тэмы, задаваць пытанні ці дзяліцца вопытам. Мы таксама імкнёмся публікаваць карысныя артыкулы. Калі з тых ці іншых прычын уладальнік экзатычнай жывёлы не можа знайсці адказ на сваё пытанне на форуме і сярод артыкулаў, ён можа адправіць запыт на электронны адрас сайта. Мы абавязкова дапаможам знайсці спецыяліста, які кампетэнтна ўсё растлумачыць. Такая практыка дазваляе значна спрасціць працэс догляду жывёл.



Што датычыцца ветэрынарнай дапамогі, то і гэта ўжо не праблема. Ёсць спецыялісты, якія ведаюць, як знайсці агульную мову менавіта з такімі гадаванцамі і як іх лячыць. З неахвотай бяруцца толькі за павукоў, бо з імі абыходзіцца асабліва складана. Хаця і хварэюць яны рэдка. Не ведаю, як у астатніх, а мае блізкія вельмі добра ставяцца да такога захаплення.

**Дар'я АРЭФ'ЕВА,**
**студэнтка IV курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**